# Літаратурная зорка 1920-х гадоў

*«Я б хацеў напісаць кнігу, ад якой у людзей было б светла і хораша на душы».*
*Міхась Зарэцкі*

***20 лістапада адзначаецца дзень нараджэння Міхася Зарэцкага, пачынальніка рамантычнага кірунку ў беларускай савецкай прозе. Пісьменнік пражыў усяго 35 гадоў, але за гэты час узбагаціў беларускую літаратуру апавяданнямі, аповесцямі і раманамі, п'есамі, нарысамі і крытычнымі артыкуламі. Зарэцкі быў сапраўднай літаратурнай зоркай 1920-х гадоў: яго творы карысталіся вялікім попытам чытачоў, кнігі выносілі з бібліятэк, выкрадалі з шафаў з забароненымі матэрыяламі, а з некаторых нават вырывалі найбольш цікавыя старонкі. Пісьменніка і яго творчасць высока ацэньвалі сябры і калегі, яго выступленні ў прэсе жыва абмяркоўваліся і выклікалі гарачыя спрэчкі. У наш час спадчына Зарэцкага не страціла сваёй мастацкай каштоўнасці, бо праблемы, узнятыя пісьменнікам, думкі і лёсы літаратурных герояў, створаных ім, сугучны сучаснасці.***



*Міхась Зарэцкі*

Творчасць Міхася Зарэцкага даследавана недастаткова, бо імя гэтага самабытнага аўтара доўгі час выкрэслівалася з гісторыі нашай літаратуры. Многае з таго, што было ім напісана, асабліва ў апошнія гады жыцця, не захавалася. Сёння спадчына пісьменніка патрабуе новага прачытання і больш глыбокай ацэнкі даследчыкаў. Пошук, перавыданне яго твораў, перагляд ацэнак, дадзеных літаратуразнаўцамі ў савецкі час, застаецца наперадзе. Як адзначыў крытык Міхась Мушынскі: «*...нам яшчэ доўга давядзецца разгадваць сакрэты абаяльнасці мастацкай прозы Міхася Зарэцкага, сакрэты яе ўздзеяння на пачуцці чытача*».

Міхась Зарэцкі (сапраўднае імя Міхаіл Яўхімавіч Касянкоў) нарадзіўся 20 лістапада 1901 г. у сяле Высокі Гарадзец Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Талачынскі раён Віцебскай вобласці) у сям'і вясковага дзяка Яўхіма Ануфрыевіча Касянкова і яго жонкі Пелагеі Лявонцьеўны. Міхась быў другім дзіцём пасля старэйшага Івана, за ім нарадзіліся малодшыя брат і сястра – Мікалай і Ліза. Дзяцінства будучага пісьменніка прайшло ў вёсцы Зарэчча пад Шкловам, куды яго бацьку перавялі па службе. Менавіта ад мясціны з такой паэтычнай назвай і пайшоў яго вядомы літаратурны псеўданім «Зарэцкі».

На фарміраванне светапогляду Міхася значна паўплывалі бацькі. Яўхім Ануфрыевіч, кіраўнік царкоўнага хору, спрабаваў пісаць музыку, цікавіўся вуснай народнай творчасцю, быў выдатным апавядальнікам, цікава і вобразна распавядаў пра перажытае і ўбачанае. Прыродным артыстычным талентам і любоўю да спеваў вылучалася і маці Пелагея Лявонцьеўна. Творчая атмасфера, якая панавала ў доме Касянковых, спрыяла развіццю мастацкага густу дзяцей. Міхась «*ужо ў дзяцінстве ўмеў іграць на многіх музычных інструментах*», – сведчыў брат пісьменніка Мікалай.

У дзесяць гадоў хлапчука аддалі вучыцца ў Аршанскае духоўнае вучылішча, праз чатыры гады ён стаў навучэнцам Магілёўскай духоўнай семінарыі. Па ўспамінах пісьменніка, бурса прывучыла яго да самастойнага крытычнага мыслення, развіла таварыскасць, імкненне да грамадскасці. З надыходам рэвалюцыйных падзей юнак пакінуў семінарыю. Некаторы час працаваў перапісчыкам у паўвайсковай часці ў Арлоўскай губерні, але ўжо праз паўгода вярнуўся ў родную вёску, дзе быў вымушаны ўладкавацца царкоўным вартаўніком.

У лютым 1919 г. Міхась Зарэцкі атрымаў пасаду настаўніка ў пачатковай школе на Магілёўшчыне, пазней узначальваў Шклоўскі валасны аддзел народнай асветы. У 1920 г. удзельнічаў у II Усерасійскім з'ездзе работнікаў асветы, дзе быў абраны кандыдатам у члены ЦК гэтага саюза.

З 1920 па 1927 гг. М. Зарэцкі служыў у Чырвонай Арміі, і гэты перыяд адыграў вырашальную ролю ў яго псіхалогіі: «*Бясконцыя блуканні з месца на месца, безліч назіранняў і ўражанняў, блізкае знаёмства з дзесяткамі і сотнямі самых разнастайных чалавечых тыпаў – усё гэта ўзбагаціла мяне невычэрпным запасам матэрыялу, які я выкарыстаў пасля ў цэлым шэрагу сваіх апавяданняў*», – пісаў у 1928 г. пісьменнік у аўтабіяграфіі.

«Ваенны вобраз» Міхася Зарэцкага ярка занатаваў Ян Скрыган у кнізе ўспамінаў «Некалькі хвілін чужога жыцця»: «*...дзівіў ён іменна тым, што менш за ўсё быў падобны на ваеннага. Аблічча, жэсты, манера гаварыць, стаяць, усміхацца неяк вельмі ж па-цывільнаму не маглі стасавацца да формы, пярэчылі ёй <...> Тонкі, высокі і стройны, ён быў абавязкова відзён, але не ростам, а іменна вось гэтай сваёй асаблівай манерай трымацца: і свабодна, і разам з тым скавана <...> Стрыманасць і непасрэднасць як бы вечна ваююць у ім*».

**(Заканчэнне на стар. 3)**



*Міхась Зарэцкі (другі справа) са сваякамі. Фота 1926 г. З фондаў БДАМЛІМ*



*«Маладняк». У першым радзе: Н. Чарнушэвіч, А. Бабарэка, А. Вольны, Я. Пушча, А. Александровіч; у другім радзе: А. Гурло, М. Зарэцкі. Фота 1925–1926 гг. З фондаў БДАМЛІМ*

# Літаратурная зорка 1920-х гадоў

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)*

Непадобны да іншых, Міхась Зарэцкі і ў літаратуру прыйшоў вельмі незвычайна, дзякуючы сну: «*...думкі стаць пісьменнікам у мяне ніколі не было. Справа пачалася з таго, што я аднойчы ўбачыў вельмі яркі і незвычайны сон, уражанне ад якога не пакідала мяне на працягу цэлага месяца. Мне захацелася занатаваць гэтае ўражанне, і я стаў пісаць*», – успамінаў ён.

З 6 студзеня 1922 г. на старонках газеты «Савецкая Беларусь» адзін за адным пачалі выходзіць творы пісьменніка: «Ці ж так?», «Спатканне», «Сёння» («Малюнкі жыцця»), «Цішка Бабыль», «У Саўках»... Толькі на працягу 1923 г. у газеце быў змешчаны шэраг апавяданняў празаіка. У гэты перыяд Міхась Зарэцкі ажаніўся, і «*да чыстых творчых імкненняў прымяшалася і матэрыяльная зацікаўленасць*», бо «*жыў з жонкай на адным чырвонаармейскім пайку*».

У 1924 г. пісьменнік стаў сябрам літаратурнага аб'яднання «Маладняк», увайшоў у Цэнтральнае бюро арганізацыі. Неўзабаве імя Міхася Зарэцкага загучала са старонак часопісаў «Полымя» і «Маладняк». Выходзяць зборнікі яго апавяданняў: «Пела вясна» (1925), «У віры жыцця» (1925), «Пад сонцам» (1926), «42 дакументы і Двое Жвіроўскіх» (1926).

Пашыраўся дыяпазон творчасці Міхася Зарэцкага: ён звярнуўся да аповесцяў і раманаў. Сярод іх вылучаецца аповесць «Голы звер» (1926), у цэнтры якой адмоўны герой – Віктар Яроцкі, чалавек са «звярынай сутнасцю», носьбіт філасофіі эгаізму і ўсёдазволенасці. Пісьменнік у гэтым творы не толькі ўслаўляе рэчаіснасць, але і паказвае яе негатыўныя бакі. Аповесць адразу стала надзвычай папулярнай. Пісьменнік Майсей Сяднёў успамінаў, што кнігі выкрадалі з шафаў, а ў бібліятэках часта гучала пытанне: «*ці ёсць "Голы звер" Зарэцкага?*»

У 1927 г. на старонках часопіса «Полымя» друкуецца першы раман Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі». У ім аўтар паказаў сапраўдны «твар» рэвалюцыі з яе бязлітаснасцю і неправедлівымі ахвярамі. У канцы 1920-х гг. гэта было сапраўды смела. Праблема выбару чалавека, які апынуўся ў непераадольных абставінах, набыло сімвалічнае гучанне ў рамане праз скразны вобраз сцежак-дарожак, што «*пераплялііся пераплётам заклятым – не згадаць, па якой трэба пайсці, каб патрапіць на правільны шлях*».



*Сцэна са спектакля «Сымон Карызна». Дзяржаўны рускі тэатр БССР. Фота 1935 г. З фондаў БДАМЛІМ*

У 1927 г. скончыўся «маладнякоўскі» перыяд творчасці пісьменніка. Ён стаў адным з ініцыятараў утварэння літаб'яднання «Полымя». У гэты час Міхась Зарэцкі шмат падарожнічае: у 1927 г. наведаў Латвію, Германію, Францыю, Чэхаславакію. Цікавыя ўспаміны пра сумесныя падарожжы з ім па еўрапейскіх краінах пакінуў Цішка Гартны, які адзначыў, што пісьменнік захапляўся непрыбранасцю Люксембургскага саду, кажучы: «*...парк лепей выглядае тады, калі ён прадстаўляе натуру*». Ва ўсіх праявах жыцця Зарэцкі любіў гратэскавую выразнасць і экстравагантнасць, шукаў супярэчнасці, нават парадоксы, якія адлюстроўваў і ў паводзінах герояў сваіх твораў.

Адначасова са службай у арміі пісьменнік вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе разам з ім атрымлівалі адукацыю «маладнякоўцы» Андрэй Александровіч і Алесь Дудар, а пасля і Ян Скрыган. Апошні, успамінаючы 1927 г., пісаў пра Зарэцкага: «*Гэта быў ужо ў поўным сэнсе слова пісьменнік і інтэлігент. Папулярнасці і славе яго адпавядаў і вонкавы выгляд <...> Бывала, на перапынках, калі мы ўсе высыпалі на калідор, нехта першы заўважаў і абвяшчаў нямоцна: "Зарэцкі ідзе!" І праўда, у канцы калідора паяўляўся цёмна-шэры капялюш і над усімі галовамі праплываў у гардэроб*».

Аднак пасля з'яўлення ў друку вядомага «Ліста трох», у якім Андрэй Александровіч, Алесь Дудар і Міхась Зарэцкі выступілі супраць актывістаў, якія збіраліся ўчыніць «грамадскі суд» над беларускамоўнымі студэнтамі, яго аўтары пакінулі ўніверсітэт.

Зарэцкі цікавіўся тэатрам, быў ініцыятарам і актыўным удзельнікам тэатральнай дыскусіі ў 1928 г., выступаў за развіццё нацыянальнага тэатра і кіно. У 1928 г. ён напісаў п'есу «Віхор на балоце», дзе скарыстаўся звыклымі сродкамі меладрамы з яе традыцыйным любоўным трохкутнікам, трагічнымі ахвярамі як вынікам непадзельнага кахання. Пазней выйшла яго п'еса «Белыя ружы» (1928 – 1929), вытрыманая ў рамантычным ключы з элементамі прыгодніцтва, выкарстаннем паданняў і легенд. Невядомым застаецца лёс гістарычнай драмы «Рагнеда», якую пісьменнік стварыў яшчэ ў канцы 1920-х гг., але тэкст твора не знойдзены і дасюль.

У 1935 г. у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры Беларусі паставілі п'есу «Сымон Карызна», якую пісьменнік стварыў на аснове свайго рамана «Вязьмо», а ў 1936 г. пабачыла свет п'еса «Ная» – дынамічны, вострасюжэтны твор, прысвечаны тэме жыцця цыганоў. Ён быў пастаўлены Тэатрам юнага гледача. Спектакль атрымаўся яркі, але прайшоў усяго некалькі разоў і быў зняты з рэпертуару.

Майстар малой прозы, Зарэцкі піша новыя апавяданні, і ў канцы 1920-х гг. выходзяць зборнікі «На чыгунцы» (1928), «Ракавыя жаронцы» (1929). Цікава, што Ян Скрыган не разумеў назвы апошняга твора, не ведаў, куды ставіць націск у слове «*ракавыя*». Сам аўтар растлумачыў сэнс так: у сяле, дзе ён нарадзіўся, існавала павер'е, нібы ў галаве ра́ка ёсць нейкая таямнічая костачка, якая і называецца жаронцамі. Калі яе знайсці, то яна, нібы папараць-кветка, можа адкрываць людзям таямніцы шчасця.

У канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. Зарэцкі піша шэраг публіцыстычных нарысаў. Сярод іх «Падарожжа на Новую Зямлю» (1929) паводле паездкі на Мар'інскія балоты, дзе праводзілася шырокая меліярацыя забалочаных зямель. Роздумы і меркаванні пісьменніка над убачаным і склалі асноўны змест твора. Ён звязаў у нарысе сацыяльную і нацыянальную тэму, падкрэсліў неабходнасць барацьбы з пагардлівым стаўленнем да нацыянальнай культуры, крытыкаваў дзяўчат, якія «*самі сябе абакралі*», бо аддалі перавагу гарадскім рамансам, а не народным мелодыям, што складаюць багацце нацыянальнай культуры.

Пісьменнік не мог застацца ўбаку ад падзей калектывізацыі 1930-х гг. на Беларусі, якія раскрыў у нарысах «Вясна 1930 года» (1930) і «Лісты ад знаёмага» (1931). Было немагчыма адкрыта выступаць з яе крытыкай, у якой Зарэцкі бачыў трагедыю сялянства. Ён быў вымушаны абмяжоўвацца ад ацэнкі падзей, каб адвесці ад сябе абвінавачванні крытыкаў.

Адным з найбольш значных твораў празаіка, прысвечаных калектывізацыі, з'яўляецца сацыяльна-псіхалагічны раман «Вязьмо» (1932). Гэты філасофскі, востраграматычны твор прынёс яму шырокую вядомасць і быў высока ацэнены сучаснікамі і паслядоўнікамі. Іван Мележ у 1969 г. назваў «Вязьмо» «*можа быць, самым глыбокім творам тых часоў пра калектывізацыю*».

Нягледзячы на папулярнасць сярод чытачоў, удзел у Першым Усебеларускім з'ездзе пісьменнікаў у 1934 г., перыяд 1930-х гг. пазначаны драматычнымі зменамі ў жыцці Міхася Зарэцкага. Сваімі публіцыстычнымі творамі, крытычнымі выступленнямі пад час тэатральнай дыскусіі пісьменнік супярэчыў новым палітычным установкам, у выніку чаго на старонках перыядычнага друку пачалася кампанія супраць Зарэцкага. Ён быў выключаны з партыі, яго творы пачалі забараняць і ўвогуле не друкавалі. Ні талент, ні папулярнасць аўтара не засцераглі яго ад арышту, які адбыўся 3 лістапада 1936 г. Міхась Зарэцкі быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання і 28 кастрычніка 1937 г. расстраляны. Рэпрэсіі не абмінулі і яго сям'ю: жонку Марыю Іванаўну асудзілі на сем гадоў папраўча-працоўных лагераў, у 1941 г. рэабілітавалі, а ў 1945 г. зноў асудзілі ўжо на дзесяць гадоў. Малалетнія дзеці Міхася Зарэцкага – сын Слава і дачка Рада – гадаваліся ў дзіцячым доме «Боркі» Калінінскай вобласці.

Міхася Зарэцкага рэабілітавалі 7 снежня 1957 г., і яго імя вярнулася ў беларускую літаратуру.

Міхась Зарэцкі пакінуў значны след у беларускай літаратуры, хоць сам заўсёды крытычна ставіўся да сябе. Як адзначыў даследчык Анатоль Майсеенка: «*Пісьменнік быў сціплы ў ацэнцы сваёй творчасці. Ён заўсёды паўтараў, што трэба шмат і настойліва працаваць, каб быць на ўзроўні літаратурных задач. Ён марыў напісаць кнігу, ад якой у людзей было б светла і радасна на сэрцы. Не ўсе яго мары збыліся. Але тое, што ён паспеў зрабіць, варта самай пільнай увагі чытача*».

*Юлія АМОСАВА*



*Марыя Касянкова, жонка пісьменніка. Фота 1929 г. З фондаў БДАМЛІМ*



*Дзеці пісьменніка – Слава і Рада. Фота 1929 г. З фондаў БДАМЛІМ*

18 лістапада 2021 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў круглы стол «"Сцежкамі..." Міхася Зарэцкага: да 120-годдзя з дня нараджэння», на якім адбылася прэзентацыя вялікай віртуальнай экспазіцыі, прысвечанай пісьменніку. Яна была падрыхтавана ў межах праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця», які ажыццяўляецца разам з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і газетай «ЛіМ». У рэсурсе размешчаны фотаздымкі, рукапісы і дакументы пісьменніка, інфармацыя пра ўшанаванне яго памяці, цікавыя факты з біяграфіі. У раздзеле прадстаўлена 14 алічбаваных кніг Міхася Зарэцкага, што былі выдадзены пры яго жыцці і сёння захоўваюцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. З дазволу аўтараў у рэсурсе змешчаны поўныя тэксты артыкулаў сучасных даследчыкаў творчасці пісьменніка: Алены Белай, Ігара Шаладонава, Васіля Дранько-Майсюка.